*9. Коссович, К. А.* Санскрито-русский словарь / К. А. Коссович. – М. : АБВ, 2017. – 360 с.

*10.* Неокульты: «новые религии» века? / Е. С. Прокошина [и др.] ; под ред. А. С. Майхровича. – 3-е изд., доп. – Минск : Четыре четверти, 2000. – 240 с.

*11. Перзашкевич, О. В.* Варна брахманов в социальной структуре ригведийского общества : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / О. В. Перзашкевич. – Минск, 1999. – 142 л.

*12. Перзашкевич, О. В.* Ригведийское жречество / О. В. Перзашкевич. – Минск : БГУ, 2014. – 327 с.

*13. Хомяков, А. С.* Сочинения в двух томах. Работы по историософии / С. А. Хомяков. – М. : Медиум, 1994. – Том 1.

*14. Littleton, C. S.* Indo-European Religions : History of Study / C. S. Littleton // Encyclopedia of Religion : 14 vol. / ed. in chief L. Jones. – Farmington Hills, 2005. – Vol. 7. – P. 4457–4466.

*15. Mill, J.* History of British India : in 10 Volumes / J. Mill, H. H. Wilson. – London : Madden, 1858. – Volume 1.

*16. SarDesai, D. R.* Asiatic Societies of Bengal and Bombay / D. R. SarDesai // Encyclopedia of India : 4 vol. / ed. in chief S. Wolpert. – Farmington Hills, 2005. – Vol. 1. – P. 65–68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КУЛЬТУРНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ МУСУЛЬМАН У СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА

***М. А. Татарэвіч,***
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»,*
*дырэктар Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*

Сучасны свет характарызуецца тэндэнцыяй да павелічэння этнічных кантактаў, размывання культурных межаў. Важнымі фактарамі дзяржаўнага сувенірытэту і палітычнай устойлівасці сусветных супольнасцей выступаюць не толькі рэлігійная і грамадская ідэнтычнасць, але і этнічна-культурная разнастайнасць супольнасці. У беларускім шматнацыянальным грамадстве асаблівае месца займае мусульманская культурная традыцыя. Згодна з апошнім перапісам, іслам у краіне вызнаюць каля 27 народаў, што складае больш за 30 000 чалавек [2]. Калі параўноўваць статыстыку з папярэднімі перапісамі (1989, 1999), то назіраецца павелічэнне колькасці азербайджанцаў, арабаў, асецін, таджыкаў, туркмен, але паменшылася колькасць татараў. У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае комплекснае даследаванне мусульманскага складніка

нацыянальнай культуры, спецыфікі яго інтэграцыі ў Беларусі. Дадзены працэс характарызуецца мнагамернасцю і скіраванасцю на дасягненне высокага ўзроўню сумяшчальнасці з беларускім культурным асяроддзем. Вынікі культурнай інтэграцыі мусульман ва ўмовах беларускай сацыякультурнай прасторы з'яўляюцца адной з актуальных праблем у тэарэтыка-метадалагічным і практычным аспектах. Гэта абумоўлена не толькі фундаментальнасцю праблем інтэграцыі ў сучасных сацыягуманітарных навуках, але і патрабаваннем часу, рэаліі якога прымушаюць шукаць новыя інтэграцыйныя рэсурсы ў сучасным зменлівым свеце.

Пры разглядзе працэса культурнай інтэграцыі мусульман у Беларусі неабходна ўлічваць культурна-гістарычныя асаблівасці, характэрныя для нашага рэгіёну, бо яны ў значнай ступені ўплываюць на спецыфіку ўзаемадзеяння беларускага насельніцтва і носьбітаў ісламскай традыцыі. Мясцовае насельніцтва Беларусі мае шматвяковы вопыт кантактавання з носьбітамі ісламскай культурнай традыцыі і, больш за тое, іслам ужо на працягу многіх стагоддзяў прысутнічае ў беларускай культурнай прасторы як яго арганічная частка. Так, першымі носьбітамі ісламскай традыцыі на беларускіх землях былі татары (пачатак XIV ст.). Вядома, што яны служылі ў войсках князёў Вялікага Княства Літоўскага, прычым нярэдка вызначаліся адвагай і мужнасцю. Іншы раз кіраўнікі ВКЛ запрашалі прадстаўнікоў татарскай нацыянальнасці з Залатой Арды і Крыма, надзяляючы іх на Беларусі і Літве зямельнымі надзеламі, вызваляючы ад падаткаў і г.д. Неабходна адзначыць і той факт, што частку татарскага насельніцтва на тэрыторыі ВКЛ складалі ваеннапалонныя падчас паходаў і асобныя групы татараў, якія добраахвотна перасяляліся ў Беларусь і Літву [1, с. 125]. Такім чынам, Беларусь мае больш чым шасцісотгадовы вопыт прысутнасці ісламу на сваіх землях, а беларускі народ мае вельмі працяглы вопыт узаемадзеяння і сумеснага пражывання з носьбітамі ісламскага веравызнання і культурнай традыцыі.

Важным фактарам культурнай інтэграцыі мусульман з'яўляецца рэлігійнасць, якую складана лічыць пастаяннай велічынёй. Толькі ўмоўна можна вызначыць ступень яе дамінавання у той ці іншай мусульманскай абшчыне, бо значэнне ісламу ў паўсядзённым жыцці можа істотна змяняцца з цягам часу. Зніжэнне ступені рэлігійнасці мусульман залежыць ад часу знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь і ступені ўключанасці ў беларускую культуру. Ступень зніжэння ўзроўню рэлігійнасці і развіцця рэлігійнай культуры абумоўлены і кантролем з боку сацыяльнага акружэння за ходам выканання рэлігійных прадпісанняў і недастатковай прысутнасцю ісламу ў культурна-інфармацыйнай прасторы. Заканамерна, што гэтыя акалічнасці ўплываюць і на характар інтэгра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйных працэсаў. Многае непасрэдна залежыць ад сацыяльнага асяроддзя мусульман, актыўнасці іх узаемадзеяння з карэнным насельніцтвам, што спрыяе, як правіла, куды менш строгаму выкананню рэлігійных прадпісанняў.

Як вынік, у працэсе інтэграцыі адбываецца трасфармацыя не толькі рэлігійнасці мусульман, але і іх культурнай ідэнтычнасці, бо індывід трапляе з аднаго сацыякультурнага асяроддзя ў іншае. У самым спрошчаным выглядзе этнічная ці культурная ідэнтычнсць мусульман уключае ўсведамленне, катэгарызацыю або самаідэнтыфікацыю іх як членаў этнакультурнай групы. Яна звязана з самасцвярджэннем, гонарам і пазітыўнай ацэнкай мусульман як групы. Ім уласцівы пэўны характар паводзін, а таксам пэўныя каштоўнасныя і традыцыйныя арыентацыі.

Апынуўшыся ў новай сацыякультурнай прасторы, мусульмане, чыя ідэнтычнасць фарміравалася ў зусім іншых сацыякультурных умовах, сутыкаюцца з цяжкасцямі, звязанымі з кардынальнымі зменамі самага шырокага дыяпазону: іншая культура, прырода, клімат, іншыя ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Самая важная частка змен – культурныя: мова, звычаі, традыцыі, рытуалы, нормы і каштоўнасці. Культура, да якой належыць суб’ект ісламскай традыцыі, вызначае і рэгулюе яго паводзіны.

У выніку праведзенага даследавання неабходна адзначыць, што ў працэсе інтэграцыі змяняецца ідэнтычнасць мусульман. Па-першае, у мусульман, як прадстаўнікоў традыцыйных культур з уласцівым ім рэгламентаваннем паводзінаў і моцнай уладай традыцый, яна з'яўляецца менш гнуткай. Па-другое, у тых краінах, дзе на дзяржаўным узроўні абвешчана палітыка культурнага плюралізму, што прадугледжвае роўнасць, свабоду выбару і партнёрства, інтэграцыя адбываецца лягчэй і змены ідэнтычнасці менш складаныя. Па-трэцяе, істотны ўплыў на інтэграцыю аказвае талерантнасць культуры прымаючага грамадства.

Вынікам большай прыхільнасці да рэлігійных каштоўнасцей у асяроддзі мусульман з’яўляецца тое, што большасць з іх лічаць неабходным наведванне мячэці. Рэлігія для мусульман з’яўляецца дамінантным фактарам культурнай інтэграцыі. Яна аб’ядноўвае іх у адну рэлігійную суполку, дзякуючы чаму захаўваецца этнічная супольнасць. У храме мусульман у самым сканцэнтраваным выглядзе прадстаўлена адметнасць этнасу. Тут яна захавалася найбольш некранутай на працягу стагоддзяў. Мячэць не проста матэрыяльны аб’ект, але і сімвал веры, выражаны ў семантыцы экстэр’ера і інтэр’ера храма. Асабістае спасціжэнне духоўных каштоўнасцей, асваенне культурнай прасторы, у якой чалавек здабывае сваю радавую чалавечую сутнасць і ў той жа час застаецца самастойным сапраўдным суб’ектам жыццядзейнасці, адбываецца праз калектыўнае дзеянне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інструментам інтэграцыі носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі выступаюць мусульманскія рэлігійныя аб'яднанні. Яны змаглі арганізаваць сістэматычную працу па вывучэнні сваёй культуры, а таксама яе прэзентацыі ў рамках маштабных этнакультурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на рэгіянальным, абласным і рэспубліканскім узроўнях. Дзейнасць муслімманскіх абшчын і рэлігійных аб'яднанняў ажыццяўляецца ў асноўным у наступных формах: этнакультурныя мерапрыемствы, праекты, семінары; публікацыі ў СМІ; стварэнне ўласных сайтаў, груп у сацыяльных сетках; вывучэнне арабскай мовы; сустрэчы з прадстаўнікамі абшчын; рэгулярныя заняткі па вывучэнню асноў ісламa; удзел у дзейнасці абшчыны; моладзевыя лагеры для хлопчыкаў і дзяўчат на базе мячэцей Мінска і Іўя [3].

Вынікам шматграннай дзейнасці аб'яднанняў з'яўляецца значны ўклад ва ўмацаванне этнакультурнага адзінства мусульманскіх народаў, далейшае іх культурна-грамадскае развіццё. Аналіз дзейнасці грамадска-культурных аб'яднанняў паказаў, што яна аказвае вельмі значны ўплыў на асяроддзе мусульман. Часта суайчыннікі з'яўляюцца для мусульман галоўным колам зносінаў, а традыцыйны калектывізм усходніх народаў варта разглядаць як фактар, які дапамагае мусульманам не раствырыцца ў беларускім грамадстве.

Такім чынам, вынікам інтэграцыйнага працэсу мусульман у беларускую культуру з'яўляецца ўзбагачэнне кожнай з культур якасна новым вопытам, традыцыямі, узорамі, каштоўнасцямі пры ўмове захавання унікальных асаблівасцей і фенаменалагічнай прыроды кожнай з культур, якія ўзаемадзейнічаюць. Праведзены аналіз дае падставы сцвярджаць, што інтэграцыйны працэс мае супярэчлівы характар ў нашым грамадстве. Сярод фактараў, якія спрыяюць яму, варта назваць наяўнасць мячэцей, рэлігійных аб'яднанняў, абшчын, веданне мовы. Між тым выяўленыя складанасці ў культурнай інтэграцыі можна растлумачыць значнымі адрозненнямі ў сферы культуры паміж мусульманамі і карэннымі жыхарамі Беларусі. Больш рэлігійныя мусульмане ў цэлым толькі часткова прымаюць базавыя каштоўнасці і нормы беларускага грамадства.

---

*1. Дубянецкі, С.* Татары на Беларусі : рассяленне, становішча і адносіны з беларусамі / С. Дубянецкі // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай іншымі культурамі: Матэрыялы другой міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 19–29 траўня 1995 г.; рэдкал. : І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 125–130

*2.* Перепись населения 2009 : стат. зборник: в 3 т. / Нац. стат. ком-т Респ. Беларусь; редкол.: В. И. Зиновский (пред.) [и др.]. – Минск : РУП



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Информационно-вычислительный центр Национального статистического комитета Республики Беларусь», 2011. – Т. III: Национальный состав населения Республики Беларусь. – 433 с.

*3.* Рэспубліканскае рэлігійнае аб'яднанне «Мусульманскае Рэлігійнае Аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.mechet.by/post/детский-лагерь-1. – Дата доступу: 26.02.2020.

## КАМЕРНО-ИНСТРУМЕНТАЛЬНЫЕ СОЧИНЕНИЯ БЕЛОРУССКИХ КОМПОЗИТОРОВ ИЗ ЦИКЛА КОНЦЕРТОВ «ТРАМОНТАНА»: К ВОПРОСУ О МУЗЫКАЛЬНОЙ ТЕМАТИКЕ

***А. А. Тихомирова,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры теории музыки учреждения образования*
*«Белорусская государственная академия музыки»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цель настоящей статьи – акцентировать научно-исследовательский подход к пониманию «темы» в широком смысле слова. В качестве аналитического рассмотрения музыкального материала, на который мы опираемся в русле предложенной проблематики, представлена современная камерно-инструментальная музыка белорусских композиторов.

Как известно, наиболее употребительным в музыкознании является понимание темы как неотъемлемого атрибута музыкальной формы, которая является ее смысловым концентратом и является основой развития. Однако существует и менее распространенная в научно-исследовательской литературе трактовка темы в *общеэстетическом, или литературоведческом* смысле. В литературной энциклопедии тема определяется как «круг событий, образующих жизненную основу эпического или драматического произведения и одновременно служащих для постановки философских, социальных, этических и других идеологических проблем [5, с. 459]. Исходя из данного определения, тему можно сопоставить со смежными понятиями сюжета и идеи, а тематика служит одним из жанрообразующих принципов.

Литературоведы А. Жолковский и Ю. Щеглов писали о двух типах тем: «темы первого рода» – *идейные, или предметные* темы, т. е. высказывания в широком смысле слова о реальном мире и «темы второго рода» – *стилистические, или орудийные* темы, т.е. установки относительно языка и других орудий художественного выражения» [3, с. 18].